This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2019.pp.523-556

Przegląd Środkowo-Wschodni, 4, 2019
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20190420

Data przesłania: 15.08.2017
Data akceptacji: 23.05.2018

**Сяргей Новікаў**
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт
novikau@tut.by
ORCiD: 0000-0001-8503-5250

# Праблематыка нацысцкага генацыду ў раёне вёскі Малы Трасцянец у 1942–1944 гадах у святле найноўшых і ранейшых даследаванняў

*Тростенец: трагедия народов Европы, память Беларуси. Документы и материалы,* сост.: В. Адамушко [и др.]; редкол.: В. Андриевич (гл. ред.) [и др.], Минск 2016.

Першая мая навуковая рэцэнзія была прысвечана малавядомаму беларускім ваенным гісторыкам артыкулу на нямецкай мове, у якім Ю. Туронак раскрываў характар ідэалагічнай вайны падчас нямецкай акупацыі Беларусі[1]. Радкі з той рэцэнзіі, у якіх ішла размова пра адносіны мірнага насельніцтва да нямецкіх акупантаў у 1941 годзе, затым трапілі на вокладку збору твораў Ю. Туронка «Мадэрная гісторыя Беларусі»[2]. Але ні рэцэнзія, ні рэцэнзаваны артыкул не давалі поўнага ўяўлення пра ідэалагічнае змаганне ў акупіраванай Беларусі. Паводле польскага аўтара, усё зводзілася да супрацьстаяння нацысцкай і бальшавіцкай ідэалогій. Тым часам па-за ўва-

[1] Jerzy Turonek, *Weißruthenien: Zweifrontenkrieg der Ideologien* [in:] *Anpassung – Kollaboration – Widerstand: kollektive Reaktionen auf die Okkupation,* hrsg.: W. Benz u. a., Berlin 1996, s. 191–198, рэц. С. Новікаў, «Беларускі гістарычны агляд» 1998, т. 5, сш. 2 (9), с. 577–580.

[2] Ю. Туронак, *Мадэрная гісторыя Беларусі,* Vilnius 2006.

гай Ю. Туронка і рэцэнзента заставаліся іншыя рэальныя суб'екты узброенай і інфармацыйнай барацьбы ў Беларусі, сярод якіх былі структуры мясцовага беларускага самакіравання, фарміраванні польскай Арміі Краёвай, украінскага паўстанцкага руху[3].

У гэтай рэцэнзіі ў метадалагічным ключы, які ў сваіх працах выкарыстоўваў Ю. Туронак, разглядаецца новая кніга пра масавае знішчэнне нямецкімі акупантамі і мясцовымі памагатымі мірных грамадзян розных нацыянальнасцей, у тым ліку яўрэяў з Беларусі, Германіі, Аўстрыі, Чэхаславакіі ў спецыяльна падрыхтаваных для гэтага месцах у раёне вёсак Малы і Вялікі Трасцянец каля Менска – у лагеры для прымусовага ўтрымання і выкарыстання працоўнай сілы і іншых прылеглых да яго трох месцах масавага знішчэння людзей – ва ўрочышчах Благаўшчына, Шашкоўка і ў былой калгаснай адрыне каля в. Малы Трасцянец. Зборнік дакументаў і матэрыялаў «Тростенец: трагедия народов Европы, память в Беларуси»[4] выйшаў у 2016 годзе тыражом 550 экзэмпляраў. Падрыхтавала выданне група аўтараў-укладальнікаў: В. І. Адамушка, А. Я. Далгоўскі, Ю. У. Звераў, Н. Я. Калеснік, М. Я. Тумаш, Н. А. Яцкевіч, кіраўнік групы галоўны архівіст Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ) В. Д. Селяменеў. Выданне падрыхтавана НАРБ разам з Цэнтральным архівам КДБ Рэспублікі Беларусь (ЦА КДБ РБ), Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (БДМГВАВ), Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтрам імя Ёханэса Рау. Кнігу выдала выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі». Тыраж новага выдання не трапіў у кнігарні, быў толькі перададзены ў бібліятэчныя фонды Беларусі.

Дагэтуль беларускімі гісторыкамі не праведзена ўсебаковае навуковае даследаванне тэмы знішчэння людзей у адзначаным раёне.

---

[3] E. Mironowicz, *Wojna wszystkich ze wszystkimi. Białoruś 1941–1944,* Kraków 2015.

[4] *Тростенец: трагедия народов Европы, память Беларуси. Документы и материалы,* сост.: В. Адамушко [и др.]; редкол.: В. Андриевич (гл. ред.) [и др.], Минск 2016.

Хаця праблематыка набыла значны міжнародны маштаб. Часткова асвятліць тэму дапамагаюць спецыяльныя дакументальныя выданні, падрыхтаваныя ў 2000-я гады ў Беларусі[5]. Але далей за падрыхтоўку і выданне арыгінальных крыніц справа не пайшла.

Прэзентацыя кнігі «Трасцянец» адбылася 20 чэрвеня 2016 года ў НАРБ, але яе змест дагэтуль не стаў прадметам навуковага аналізу і шырокага абмеркавання нават у святле таго, што за год да выхаду зборніка быў адкрыты мемарыяльны комплекс «Трасцянец», спраектаваны калектывам архітэктараў «Мінскпраекта».

Таму варта больш падрабязна пазнаёміць чытачоў са зместам прапанаванай да разгляду кнігі і выказаць пэўныя навуковыя заўвагі.

Падчас прэзентацыі выдання В. Д. Селяменеў выказаў спадзяванне, што «зборнік дакументаў падштурхне даследчыкаў да глыбокага вывучэння тэмы Трасцянца. Яшчэ шмат застаецца пытанняў без адказу: дакладна невядомая колькасць загінуўшых у гэтым лагеры смерці. Увесь час называюцца розныя лічбы, а для дакладнага вызначэння колькасці патрэбна яшчэ шмат працаваць»[6]. Такая пастаноўка праблемы сугучная таму, што аўтар гэтых радкоў пісаў некалькі гадоў раней[7] пра месца масавага знішчэння людзей ва ўрочышчы Благаўшчына: неабходна правядзенне спецыяльнага навуковага даследавання па гэтай тэме. Падкрэслім яшчэ думку: у беларускай гістарычнай навуцы праца такога жанру пакуль не з’явілася. Хоць для прафесійнага чытача такі падыход больш чым відавочны і бясспрэчны. У сувязі з гэтым узнікае пытанне: у су-

[5] *Тростенец,* сост.: С. Жумарь, Р. Черноглазова, Минск 2003; *Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы,* сост.: В. Адамушко, Г. Кнатько, Н. Калесник, В. Селеменев, Н. Яцкевич, ред. Г. Кнатько, Минск 2003.

[6] *Выйшаў зборнік архіўных матэрыялаў, прысвечаных Трасцянцу* [online], http://zviazda.by/be/news/20160620/1466441699-vyyshau-zbornik-arhiunyh-materyyalau-prysvechanyh-trascyancu [доступ: 10.08.2017].

[7] С. Новікаў, *Урочышча Благаўшчына – месца масавага знішчэння людзей на тэрыторыі Беларусі,* «Беларускі гістарычны часопіс» 2013, № 10, с. 27.

вязі з адсутнасцю такой працы наколькі новы зборнік дакументаў і матэрыялаў можа яе замяніць, у якой ступені дапаможа наблізіць чытача да разумення сутнасці гістарычных падзей і сфарміруе ўстойлівае ўсведамленне актуальнасці далейшага ўсебаковага вывучэння трагічных падзей у Трасцянцы?

Зборнік складаецца з дзвюх галоўных частак: «Трасцянец» (с. 25–356) і «Памяць» (с. 357–447), а таксама неабходных навуковых элементаў: уступнага слова ўкладальнікаў (с. 3–6), прадмовы (с. 7–22), каментарыяў (с. 470–479), імяннога (с. 482–492) і геаграфічнага (с. 493–500) паказальнікаў, пераліку дакументаў (с. 501–515) і спісу выкарыстаных скарачэнняў (с. 516–519). Навукова-даведачны характар зборніку таксама надаюць тэкстуальныя заўвагі да дакументаў, змешчаныя ў падрадковых спасылках.

У дзве галоўныя часткі зборніка ўключаны 255 дакументаў і матэрыялаў: 116 з НАРБ, 37 з ЦА КДБ РБ і архіва ўпраўлення КДБ РБ па Віцебскай вобласці, 30 з архіва Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, 22 з Дзяржаўнага архіва Латвіі (ДАЛ), 18 з Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). Большая частка дакументаў і матэрыялаў уводзіцца ў навуковы абарот упершыню[8]. Таксама выкарыстаны дакументы з фондаў БДМГВАВ, Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці, Занальнага дзяржаўнага архіва г. Маладзечна, архіва Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і матэрыялы перыядычнага друку. Сярод дакументаў першай часткі прыведзены акты Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх саўдзельнікаў і прычыненага імі ўрону грамадзянам, калгасам, грамадскім арганізацыям, дзяржаўным прадпрыемствам і ўстановам СССР (НДК СССР), даведкі, справаздачы, тэлеграмы, данясенні, а таксама паказанні, пратаколы апытанняў і допытаў жыхароў в. Малы і Вялікі Трасцянец, былых вязняў лагера, служачых паліцэйскіх батальёнаў, нямецкай паліцыі бяспекі і СД. У другой частцы дру-

[8] *Лагерь смерти…*

куюцца пісьмы, рашэнні мінскіх гар- і аблвыканкама, пастановы Савета Міністраў і Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і інш.

У ілюстрацыйнай частцы зборніка друкуюцца фотаздымкі з фондаў НАРБ, БДМГВАВ, Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці, Беларускага тэлеграфнага агенцтва, а таксама фатографа А. П. Дрыбаса.

Адкрывае зборнік дакументаў і матэрыялаў кароткае ўступнае слова, у якім аўтары-ўкладальнікі ўводзяць чытача ў праблему. Вельмі важна, што тут закранаецца яе гістарыяграфія і згадваюцца асноўныя этапы вывучэння тэмы. З тэксту вынікае, што асобныя дакументальныя звесткі аб трагічных падзеях у Благаўшчыне, Шашкоўцы і каля в. Малы Трасцянец упершыню былі апублікаваны ў 1965 годзе ў зборніку «Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941–1944 гг.»[9]. Наступны крок па зборы дакументаў у рамках гэтай важнай тэмы беларускія гісторыкі зрабілі ў пачатку 2000-х гадоў. Так, у 2003 годзе НАРБ і БДМГВАВ выдалі зборнік «Лагерь смерти Тростенец» са 117 дакументамі і матэрыяламі пад рэдакцыяй вядучага архівіста НАРБ Г. Д. Кнацько[10]. У тым жа годзе творчы калектыў у складзе С. У. Жумара і Р. А. Чарнаглазавай падрыхтавалі навукова-папулярнае выданне «Трасцянец» з 27 дакументамі і 49 ілюстрацыямі[11]. На наш погляд, заслугай укладальнікаў дзвюх гэтых прац з’яўлялася тое, што яны, з аднаго боку, імкнуліся ўвесці ў шырокі ўжытак новыя пісьмовыя крыніцы, выяўленыя ў архівах Беларусі, а з другога – спрабавалі ўнесці сваю лепту ў справу навуковай ацэнкі гістарычных падзей у «Трасцянцы». Галоўным навуковым здабыткам першага зборніка

---

[9] *Акт Минской областной комиссии о массовом истреблении советских граждан на территории гор. Минска и его окрестностей немецко-фашистскими захватчиками в 1941–1944 гг. от 13 августа 1944 г.* [в:] *Преступления немецко-фашистских захватчиков в Белоруссии. 1941–1944 гг.*, Минск 1965, с. 222–227.

[10] *Лагерь смерти…*

[11] *Тростенец.*

можна лічыць імкненне да ўвядзення ўніфікаванай абагульненай назвы «лагер смерці Трасцянец» – буйнейшае на тэрыторыі Беларусі месца масавага знішчэння «савецкіх ваеннапалонных, яўрэяў Беларусі і заходнееўрапейскіх краін, падпольшчыкаў і партызан, жыхароў Мінска, арыштаваных у якасці заложнікаў»[12]. У той жа час аўтары-укладальнікі другога зборніка прапанавалі ў якасці абагульненай назвы новую дэфініцыю – «тэрыторыя смерці Трасцянец»[13]. Заўважым, што новыя азначэнні амаль не адрозніваюцца ад назвы «Трасцянецкі лагер смерці», вядомай з канца 1980-х гадоў[14]. Варта напомніць, што ў выдадзенай у 1986 годзе шматтысячным тыражом папулярнай брашуры супрацоўніцы БДМГВАВ А. Г. Ванькевіч «Экскурсия в Тростенец»[15] выкарыстоўвалася назва «канцэнтрацыйны лагер смерці Малы Трасцянец»[16], што дагэтуль выкарыстоўваецца нават прафесійнымі гісторыкамі.

У 1970-я гады В. П. Раманоўскі выкарыстоўваў назву «канцлагер Трасцянец». У выніку, к нашаму часу ў дачыненні да тэрыторыі в. Вялікі і Малы Трасцянец і іх ваколіц, дзе адбываліся масавыя забойствы людзей, ужываецца адзіная геаграфічная назва – Трасцянец. Аднак, на самай справе, гістарычныя падзеі адбываліся вакол в. Вялікі і Малы Трасцянец, у трох месцах масавага знішчэння людзей – урочышчах Благаўшчына, Шашкоўка і калгаснай адрыне каля в. Малы Трасцянец. Кожная з гэтых назваў фігуруе ў дакументах Беларускай рэспубліканскай камісіі садзейнічання ў рабоце НДК СССР[17]. Ад сябе заўважым, што пэўную эвалюцыю ў назвах

[12] *Лагерь смерти...,* с. 3.

[13] Т. Падаляк, *Тэрыторыя смерці,* «Звязда» 2004, 2 сакавіка.

[14] В. Раманоўскі, *Трасцянецкі лагер смерці* [у:] *Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941–1945. Энцыклапедыя*; рэдкал.: І. Шамякін (гал. рэд.) і інш., Мінск 1990, с. 590.

[15] А. Ванькевич, *Экскурсия в Тростенец,* Минск 1986.

[16] *Ibidem*, с. 7.

[17] *Из справки отдела Белорусской республиканской комиссии содействия в работе ЧГК СССР Г. Л. Логинова о массовом истреблении гражданского населения в окрестностях Минска в 1941–1944 гг.* [в:] *Лагерь смерти...,* с. 116.

давялося прайсці і першаму беларускаму даследчыку праблемы В. П. Раманоўскаму, які ў пачатку 1970-х гадоў спрабаваў не толькі навукова апісаць гістарычныя падзеі ў раёне в. Вялікі і Малы Трасцянец, але і ўвёў у навуковы ўжытак агульную лічбу ахвяр колькасцю 206500 чалавек, не прыводзячы спасылак на дакументальныя крыніцы гэтых даных[18]. Пачынаючы з дысертацыйнага даследавання В. П. Раманоўскага, якое так і не было апублікавана асобнай манаграфіяй, можна прасачыць тыя назвы, якія выкарыстоўваў гісторык: «канцлагер Трасцянец» (1974), «лагер смерці Малы Трасцянец», «Трасцянецкі лагер смерці» (1990).

Кажучы пра «Трасцянец», гісторыкам неабходна ўлічваць, што ў навуковай літаратуры цяпер выкарыстоўваецца назва, якая спалучае ў сабе адразу некалькі месц масавага знішчэння і ўтрымання людзей на прылеглай да в. Вялікі і Малы Трасцянец тэрыторыі: урочышча Благаўшчына – месца масавых расстрэлаў у 1942–1943 гадах; працоўны лагер – месца ўтрымання вязняў лагера для выкарыстання ў якасці працоўнай сілы ў падсобнай гаспадарцы паліцыі бяспекі і СД Менска (1942–1944 гады); урочышча Шашкоўка – месца масавага спальвання людзей (1943–1944 гады); месца расстрэлу і спальвання людзей побач з працоўным лагерам каля в. Малы Трасцянец (чэрвень 1944 года). Аднак заўважым, што ў навуковых выданнях нельга знайсці адказу на пытанне аб галоўнай прычыне пераўтварэння часова дзеючага працоўнага лагера, створанага каля в. Малы Трасцянец, у адно з цэнтральных месц знішчэння людзей на тэрыторыі Беларусі[19]. На наш погляд, адной з галоўных прычын былі ваенна-стратэгічныя змены, якія адбыліся ў канцы 1941 года на ўсходнім фронце, калі група нямецкіх армій «Цэнтр» у выніку

---

[18] В. Романовский, *Немецко-фашистская оккупационная политика и ее крах в Белоруссии (1941–1944 гг.). Диссертация на соискание ученой степени доктора исторических наук. 07.00.02,* Минск 1974.

[19] W. Benz, *Nationalsozialistische Zwangslager. Ein Überblick* [in:] *Der Ort des Terrors. Geschichte der nationalsozialistischen Konzentrationslager. In 9 Bd.* Bd. I. Die Organisation des Terrors. 2. Auflage, München 2006, s. 24.

контрнаступлення Чырвонай Арміі пад Масквой была вымушана не толькі адступіць, пакінуўшы захопленыя да таго часу савецкія тэрыторыі. Таксама немцы былі вымушаны тэрмінова ўдакладняць свае першапачатковыя захопніцкія планы, а таксама нацысцкую праграму вынішчэння яўрэяў з заходне- і цэнтральнаеўрапейскіх краін. Таму прыйшлося адмовіцца ад першапачатковай ідэі стварэння ў Магілёве на беразе Дняпра месца масавага знішчэння накшталт Аўшвіца, а шукаць такое месца ў ваколіцах Менска[20].

Як адзначаецца ва ўступным слове да зборніка дакументаў, які тут разглядаецца, сабраныя ў зборніку 2003 года дакументы і матэрыялы «не дазваляюць цалкам раскрыць гісторыю гэтага месца масавага знішчэння людзей» (с. 3). У сувязі з выхадам новага зборніка ўкладальнікі выказваюць перакананне ў тым, што новыя даныя, якія вынікаюць з дакументаў судовых працэсаў і паказанняў сведак, будуць садзейнічаць больш дакладнаму вызначэнню механізмаў з’яўлення і функцыянавання падсобнай гаспадаркі паліцыі бяспекі і СД Мінска і масавых месц знішчэння каля яе (с. 4). Галоўнай мэтай выдання з’яўляецца стварэнне на аснове крытычнага разгляду новых дакументальных крыніц магчымасці для больш дэталёвай рэканструкцыі драматычных падзей каля Малога Трасцянца ў 1942–1944 гадах. Адразу ж адзначым, што пастаўленую мэту калектыву зборніка ўдалося цалкам дасягнуць дзякуючы выяўленню, збору, сістэматызацыі і выданню самай поўнай на гэты час падборкі дакументаў і матэрыялаў.

Уводны гістарычны нарыс, які знаёміць чытача з матэрыяламі дзвюх дакументальных частак зборніка, падрыхтавалі Н. А. Яцкевіч, А. Я. Далгоўскі і Г. Л. Левіна (с. 7–22). На наш погляд, важным здабыткам гэтай часткі зборніка з’яўляюцца асобныя навуковыя ацэнкі, зробленыя аўтарамі па выніках апрацоўкі дакументаў па гісторыі ўзнікнення лагера смерці (с. 7). Так, аўтары

[20] P. Rentrop, *Tatorte der „Endlösung“. Das Ghetto Minsk und die Vernichtungsstätte von Maly Trostinez,* Berlin 2011, s. 186.

прыходзяць да важнага вываду аб тым, што ў Трасцянцы была створана і дзейнічала «сістэма масавага знішчэння», у якую былі ўключаны ўрочышчы Благаўшчына і Шашкоўка, былая калгасная адрына, а таксама працоўны лагер і ахоўны гарнізон (с. 9–11). Ва ўводным нарысе адзначаецца, што дакладны час стварэння лагера каля в. Малы Трасцянец дакументальна не вядомы. Але, зыходзячы з новых фактаў, уведзеных у абарот, вызначаецца дата стварэння лагера – пачатак 1942 года, калі паліцыя бяспекі і СД Менска пачалі выкарыстанне ў сваіх мэтах зямельных угоддзяў былога калгаса імя К. Маркса. Відавочна, што гэта разыходзіцца з традыцыйнымі ацэнкамі, замацаванымі ў беларускай савецкай і сучаснай гістарыяграфіі. Як вынікае з дакументаў, да мая 1942 года тут была створана вялікая гаспадарка па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Тут жа працавалі такія вытворчыя аб'екты, як млын, тартак і шматлікія майстэрні (сталярная, шавецкая, кравецкая і інш.), якія забяспечвалі патрэбы акупантаў. Вязні лагера працавалі штодня па 12–15 гадзін. Паводле дакументаў, рэжым утрымання там быў надзвычай жорсткі. Вязні лагера знаходзіліся пад пастаяннай пагрозай смерці, цалкам залежалі ад самавольства ахоўнікаў. Ёсць даныя аб існаванні знешніх прыкмет асноўных месц нацысцкай сістэмы прымусовага ўтрымання людзей: наяўнасць агароджы з калючага дроту пад электрычным токам, вышкі для вядзення кругласутачнай аховы лагера, гарнізона нямецкай аховы, папераджальных шыльд з надпісамі на нямецкай і рускай мовах. Нямецкая адміністрацыя і канцылярыя падсобнай гаспадаркі размяшчаліся ў былых калгасных пабудовах (с. 10).

У гэтым плане важна, што аўтары нарыса імкнуцца адэкватна ацаніць дакументальныя факты і вызначыць асноўныя функцыі працоўнага лагера і падсобнай гаспадаркі, якімі кіраваў апарат камандзіра паліцыі бяспекі і СД г. Менска, у распараджэнні якога ў першую чаргу, знаходзіліся месцы масавага знішчэння ў горадзе і яго ваколіцах. Гэта служба, як адзначаецца ў тэксце, у сваю чаргу падпарадкоўвалася Галоўнаму ўпраўленню бяспекі рэйха.

Паводле аналізу дакументаў, ахову лагера забяспечвалі латышскія добраахвотнікі, пазней фольксдойчэ, венгерскія, украінскія і беларускія паліцэйскія падраздзяленні. У канцы 1943 года на тэрыторыі лагера часова размяшчаліся сілы зондэркаманды 1005, галоўнай задачай якой з'яўлялася ліквідацыя слядоў масавага знішчэння людзей у ваколіцах Трасцянца. Аўтары адзначаюць, што ў вёсцы Малы Трасцянец таксама знаходзілася школа па падрыхтоўцы агентаў для закідвання ў партызанскія атрады. Тут жа размяшчаўся даволі моцны гарнізон з нямецкіх ваеннаслужачых і мясцовай паліцыі, на якія неаднаразова нападалі партызаны. Для супрацьдзеяння гэтаму Малы Трасцянец быў аб'яўлены «абарончай вёскай» (с. 10).

Кажучы пра ўрочышча Благаўшчына як месца масавых расстрэлаў, аўтары прытрымліваюцца агульнага падыходу, адзначаючы пры гэтым, што з вясны 1942 года яно стала месцам знішчэння дэпартаваных з краін Еўропы яўрэяў, яўрэяў з Менскага гета, а таксама месцам гібелі большасці ўдзельнікаў менскага антыфашысцкага падполля, іх сямей, партызанскіх сувязных, выкрытых і арыштаваных СД, а таксама заложнікаў (с. 9). Паказваючы агульную лічбу ахвяр ва ўрочышчы Благаўшчына, аўтары прыходзяць да важнага вываду, што гэтае месца «стала інтэрнацыянальным месцам пахавання каля 150 тысяч ахвяр нацысцкага тэрору – грамадзян Беларусі і краін Заходняй Еўропы (Германія, Аўстрыя, Чэхаславакія, Польшча)» (с. 9). Адразу звернем увагу чытача на не зусім дакладны пералік краін, некаторыя з якіх геаграфічна не адносіліся да Заходняй Еўропы. Больш за тое, уводзячы ў пералік ахвяр яўрэяў з Польшчы, аўтары заяўляюць тут уласную пазіцыю, якая не знаходзіць дакументальнага пацвярджэння ў зборніку, у першую чаргу, у прыведзеных тэлеграмах Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Цэнтр» аб руху спецыяльных цягнікоў (гл. дак. № 1, 2, 8, 9, 12). Таксама звернем увагу чытача на прыведзеную агульную лічбу ахвяр: «каля 150 тысяч». Было б больш адэкватным у гэтым выпадку прыводзіць дакументальныя даныя: яны замацаваны

ў заключным дакуменце НДК СССР, апублікаваным у зборніку (дак. № 73) – «Из справки начальника отдела Белорусской республиканской комиссии ЧГК СССР Г. Л. Логинова о массовом истреблении гражданского населения и военнопленных в Минске и его окрестностях в 1941–1944 гг.» ад 25 жніўня 1944 года[21]. Гэта ў поўным сэнсе гістарычная даведка, якая, на наш погляд, павінна з'яўляцца адзінай агульнапрынятай крыніцай для сучаснай гістарыяграфіі, бо фіксуе рэальныя маштабы вынішчэння людзей у раёне в. Вялікі і Малы Трасцянец. З улікам яе асаблівай важнасці прапануем чытачу цалкам гэты дакумент:

Минск, 25 августа 1944 г.

Большой Тростенец, лес Благовщина (тут і далей падкрэсліванні дакумента. – *С. Н.*). Обнаружено 34 ямы-могилы.

1. Длина ямы 35 м, шир[ина] 5 м, гл[убина] 3 м. В среднем в каждой яме похоронено 3675 чел.

Люди, привезенные из Германии, Чехословакии, Австрии и других государств.

В 34 ямах-могилах похоронено 150000 человек.

Малый Тростенец, лагерь.

1. Обнаружен колхозный сарай, сожженный с людьми, в количестве 6500 человек. По подсчету и медицинскому определению.

Вблизи деревни Малый Тростенец обнаружена печь-крематорий.

По показаниям свидетелей, сожжено советских жителей с 1943 г. до прихода Красной Армии 50000 человек[22].

Нагадаем чытачу, што з дакумента вынікае, што ў 34 ямах-магілах, выяўленых у лесе Благаўшчына каля Вялікага Трасцянца, пахавана 150 000 чалавек (с. 120)*. Але і гэтая лічба можа і павінна быць удакладнена, і такую спробу я ўжо рабіў[23]. Тым часам нямец-

---

[21] *Из справки…*, с. 120–121.

[22] *Ibidem*.

* Следчы (з 28 жніўня начальнік аддзела) у дакуменце прыводзіць уласныя падлікі, памнажаючы сярэднюю лічбу ахвяр у кожнай яме на агульную колькасць ям ва ўрочышчы Благаўшчына. Атрымліваецца, калі памножыць сярэднюю

кія даследчыкі значна змяншаюць як гэтую, так і агульную лічбу ахвяр Трасцянца. Гэта азначае, што навуковы пошук не спыняецца, яго неабходна працягваць, выкарыстоўваючы прынцып максімальнай паўнаты крыніц.

У пэўнай ступені ў ліку гэтых крыніц можна разглядаць грунтоўныя напрацоўкі, якія з'явіліся ў сучаснай нямецкай гістарыяграфіі па тэме Трасцянца. Піянерам стаў берлінскі даследчык П. Коль, які ў 1990 годзе выдаў першую працу, напісаную на нямецкіх дакументах, успамінах савецкіх відавочцаў і матэрыялах пасляваенных судовых працэсаў над нацысцкімі злачынцамі ў Беларусі і Германіі[24]. Асабліва важным для беларускага чытача можна лічыць той факт, што з канца 1980-х у нямецкай гістарыяграфіі месцу ў раёне в. Вялікі і Малы Трасцянец надаваўся міжнародны статус. Дзякуючы П. Колю была ўпершыню ўведзена ў шырокі ўжытак назва «беларускі Асвенцім»[25], тым самым уключаючы Трасцянец у спіс нацысцкіх лагераў смерці.

Другі нямецкі гісторык, аўтар фундаментальнага даследавання пра нямецкую акупацыйную палітыку ў Беларусі ў 1941–1944 гадах К. Герлах аб'ядноўвае месцы масавага знішчэння людзей у ра-

---

колькасць пахаваных у кожнай яме-магіле (3675) на 34 ямы-магілы, то на справе выходзіць значна меншая лічба, роўная 124950 чалавекам. Але гэта якраз тое адкрытае пытанне, якое згадваў В. Селяменеў у прадмове да выдання і якое пакуль чакае свайго далейшага даследавання. Звяртае на сябе ўвагу таксама пераканаўчае сцвярджэнне Г. Логінава на пасяджэнні Мінскай абласной камісіі 12 жніўня 1944 года, калі ён аспрэчваў думку кіраўніка камісіі Героя Савецкага Саюза В. І. Казлова аб адсутнасці фактаў прывозу яўрэяў з Германіі. Пазіцыя следчага заключалася ў тым, што ва ўрочышчы Благаўшчына каля Вялікага Трасцянца ў 34 ямах «пахавана выключна яўрэйскае насельніцтва, прывезенае з Германіі. Там пахаваны гамбургскія яўрэі» (с. 112). Важна адзначыць, што пазіцыю следчага падтрымаў акадэмік М. Н. Бурдэнка, які прадстаўляў НДК СССР.

[23] С. Новікаў, *Урочышча Благаўшчына…,* с. 27–34.

[24] P. Kohl, *„Ich wundere mich, dass ich noch lebe": sowjetische Augenzeugen berichten,* Gütersloh 1990.

[25] *Ibidem*, s. 91.

ёне Трасцянца пад назвай «лагера смерці». На яго погляд, агульная лічба ахвяр, у тым ліку дэпартаваных яўрэяў з Аўстрыі, Германіі і Чэхаславакіі, пахаваных ва ўрочышчы Благаўшчына, складала ад 40 да 50 тысяч чалавек. Заўважым, што нямецкі даследчык у той жа час пагаджаецца з лічбай ахвяр, знішчаных у калгаснай адрыне ў канцы чэрвеня 1944 года, але агульную колькасць ахвяр у раёне Трасцянца вызначае лічбай «каля 60 тысяч чалавек», выкарыстоўваючы пры гэтым агаворку – «паводле грубых падлікаў»[26].

Важны ўклад у сучасную нямецкую гістарыяграфію ўносіць даследаванне гісторыка П. Рэнтрап «Месцы масавых злачынстваў „канчатковага вырашэння". Менскае гета і месца знішчэння Малы Трасцянец»[27]. У ім аўтар не выкарыстоўвае абагульненую назву Трасцянец, а згадвае канкрэтныя месцы трагедыі – працоўны лагер Малы Трасцянец і месцы масавага знішчэння Благаўшчыну, Шашкоўку і адрыну. Даследчыца ставіць пад сумненне факт правядзення ў Благаўшчыне з восені 1941 года расстрэлаў неяўрэйскага насельніцтва і савецкіх ваеннапалонных. Працоўны лагер быў створаны на ўскраіне в. Малы Трасцянец (на тэрыторыі былога калгаса імя Карла Маркса) у канцы красавіка 1942 года. Падчас першага расстрэлу ў Благаўшчыне, які адбыўся 11 мая, знішчылі каля адной тысячы яўрэяў з Вены. Новай нам бачыцца думка даследчыцы пра тое, што аднаўленне дэпартацыі еўрапейскіх яўрэяў у кірунку Менска з'яўлялася вызначальнай умовай для стварэння месца знішчэння ў Благаўшчыне. На працягу мая – кастрычніка 1942 года ў Менск і Малы Трасцянец (праз станцыю Калодзішчы) прыбылі 16 эшалонаў з дэпартаванымі яўрэямі, з якіх: дзевяць з Вены, пяць з Тэрэзіенштата і па адным з Кёнігсберга і Кёльна. З амаль 23 тысяч дэпартаваных у Менск і Малы Трасцянец удалося застацца ў жывых толькі 75 чалавекам. Як лічыць даследчыца, агульная

[26] Ch. Gerlach, *Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944*, Hamburg 1999, s. 770.

[27] P. Rentrop, *op. cit.*

колькасць людзей, знішчаных у раёне Малога Трасцянца, складае значна менш за 60 тысяч чалавек, з якіх у Благаўшчыне было забіта больш за 30 тысяч яўрэяў[28]. Пры гэтым П. Рэнтрап адзначае, што дакладныя даныя адносна падзей, якія мелі месца на гэтай тэрыторыі, атрымаць немагчыма[29].

Звернем увагу на тое, што асновай для вывадаў нямецкай даследчыцы з'яўляюцца дакументы, у тым ліку матэрыялы судовых працэсаў над нацысцкімі злачынцамі ў пасляваеннай Германіі. У адносінах факта масавага знішчэння людзей ва ўрочышчы Благаўшчына яна звяртаецца да матэрыялаў следства над былым кіраўніком рабочай каманды Адольфам Рубэ, у склад якой таксама ўваходзілі тры-чатыры памочнікі, накіраваныя ад менскай паліцыі бяспекі і СД у распараджэнне каманды 1005, якая 27 кастрычніка – 15 снежня 1943 года праводзіла эксгумацыю цел забітых і пахаваных у 34 ямах-магілах у Благаўшчыне. Паводле А. Рубэ, яго абавязкі заключаліся ў тым, каб разам з савецкімі ваеннапалоннымі ўскрываць ямы, даставаць адтуль астанкі забітых, складваць іх у некалькі ярусаў і падпальваць. Неўзабаве, як паказаў у ходзе следства А. Рубэ, «рускія» самі настолькі добра працавалі, што яму нічога не заставалася, як назіраць за гэтым. Але тады зусім незразумела, чаму вынікам такіх «назіранняў» стала абсалютна недакладная лічба агульнай колькасці ахвяр, выяўленых у 34 ускрытых і эксгумаваных траншэях, прычым з разбежкай аж у 15 тысяч. Паводле А. Рубэ, гэта лічба складала ад 40 да 55 тысяч[30]. Відавочна, што такой вялікай разбежкі не мусіла быць, калі б А. Рубэ адказваў за падлікі і вёў іх пастаянна. Але важна, што ён згадвае імёны іншых відавочцаў і выканаўцаў, сярод якіх і імя старшага лейтэнанта (Oberleutnant) Ота Гольдапа, афіцэра з ведамства менскай паліцыі бяспекі і СД, які на працягу шасці тыдняў, г. зн. усяго часу пра-

---

[28] *Ibidem,* s. 211.
[29] *Ibidem,* s. 227.
[30] *Ibidem,* s. 212.

вядзення работ зондэркамандай 1005 ва ўрочышчы Благаўшчыну, выконваў абавязкі намесніка камандзіра (на працягу гэтага часу іх мянялі тройчы. – *С. Н.*). Як мы адзначалі ў сваім даследаванні пра ўрочышча Благаўшчыну[31], паказанні гэтага афіцэра праліваюць дадатковае святло на агульную лічбу ахвяр, але да гэтага часу гэтыя даныя не былі выкарыстаны ні нямецкімі, ні беларускімі даследчыкамі, у тым ліку аўтарамі-ўкладальнікамі зборніка дакументаў. У зборніку не нададзена таксама ўвага працы П. Рэнтрап. Паводле яе класіфікацыі, тэрыторыя каля Малога Трасцянца займае прамежкавае становішча паміж месцам масавага знішчэння і лагерам смерці.

Што да другога месца масавага знішчэння, якім з'яўлялася ўрочышча Шашкоўка, дзе з канца 1943 года пачаў дзейнічаць прымітыўны крэматорый (яма-печ), пабудаваны на ўзор кіеўскага, аўтары ўступнага нарыса да зборніка дакументаў прыходзяць да важнага вываду аб тым, што «гэтая прымітыўная печ стваралася ў канцы 1943 года як замена месцу масавага знішчэння ў Благаўшчыне» (с. 12). У сувязі з тым, што абсалютная большасць дэпартаваных яўрэяў з Заходняй Еўропы было знішчана летам 1942 года, а Менскае гета перастала існаваць у кастрычніку 1943 года, «Шашкоўка была месцам знішчэння галоўным чынам беларускага насельніцтва» (с. 12). Не менш важным з'яўляецца таксама абгрунтаваная думка аўтараў пра тое, што ў Шашкоўцы адбывалася знішчэнне і яўрэйскіх грамадзян, перш за ўсё, выбраных па прафесійных якасцях для працы на розных аб'ектах Менска, а таксама ў самім Трасцянецкім лагеры. Агульную колькасць ахвяр, якія былі спалены ў яме-печы ва ўрочышчы Шашкоўка, аўтары выводзяць, зыходзячы з вышэй згаданай запіскі Г. Л. Логінава, адзначаючы, што за восем месяцаў існавання гэтага месца (лістапад 1943 – чэрвень 1944 года) там былі знішчаны і спалены 50 тысяч грамадзян (с. 13).

[31] С. Новікаў, *Урочышча Благаўшчына…*, с. 27–34.

У якасці апошняга месца масавага знішчэння людзей аўтары ўступнага нарыса згадваюць былы калгасны хлеў, які стаў адным з элементаў «фабрыкі смерці Трасцянец» (с. 11). У ім «29 чэрвеня 1944 года, за тры дні да вызвалення Мінска Чырвонай Арміяй па загадзе намесніка каменданта лагера Рыдэра былі расстраляны, а потым спалены 6,5 тысяч чалавек» (с. 11). Пры гэтым адзначаецца, што гэта былі апошнія вязні, якія заставаліся ў працоўным лагеры, а таксама вязні менскай турмы на вуліцы Валадарскага і лагера на вуліцы Шырокай, якіх у канцы чэрвеня 1944 года вывезлі ў Малы Трасцянец, расстралялі ў хляве, а потым спалілі. У нарысе адзначана, што ў час правядзення гэтай акцыі ўдалося выратавацца толькі Сцепанідзе Савінскай і Мікалаю Валахановічу (с. 11). У дачыненні да прыведзенай вышэй цытаты аб апошнім месцы масавага знішчэння людзей хацелася б звярнуць увагу чытача на дату, калі адбываліся масавыя расстрэлы і спальванне людзей у былым калгасным хляве. Паводле пратакола допыту былога вязня лагера па вуліцы Шырокай С. І. Савінскай (дак. № 67) і артыкула пісьменніка К. Крапівы ў газеце «Звязда» ад 6 верасня 1944 года, у якім ідзе размова пра выратаванне былога партызанскага сувязнога М. І. Валахановіча (дак. № 75), масавыя расстрэлы ў хляве адбываліся не адзін, а два дні, г. зн. 29–30 чэрвеня 1944 года (с. 95, 124).

Такім чынам, аўтары гістарычнага нарыса паспрабавалі не толькі аднавіць, але і стварыць змястоўную і аб’ектыўную карціну трагедыі, паказаць маштабы знішчэння людзей у раёне в. Вялікі і Малы Трасцянец, у тым ліку савецкіх ваеннапалонных, менскіх падпольшчыкаў, партызан, іншых людзей з розных куткоў Беларусі, яўрэяў з Менскага гета і многіх краін Еўропы. Паводле прапанаванага аўтарамі матэрыялу, «лагер Трасцянец – параджэнне нацысцкай сістэмы эксплуатацыі і знішчэння вялікіх мас людзей розных нацыянальнасцей і веравызнанняў, камбінаваны варыянт месца масавага знішчэння і працоўнага лагера. Тут адбываліся спантанныя і раней спланаваныя забойствы людзей, а таксам працоўная эксплуатацыя вязняў» (с. 7). Пры гэтым аўтары выказваюць тэзіс аб тым, што

лагер Трасцянец уваходзіць у лік васьмі буйнейшых лагераў і месц масавага знішчэння ў Еўропе ў гады Другой сусветнай вайны: Аўшвіц, Трэблінка, Бэлжац, Хэлмна, Майданак, Сабібор (усе на тэрыторыі Польшчы), Ясенавац (Харватыя). Заўважым, што такое пашырэнне геаграфіі назваў месц, дзе адбываліся масавыя злачынствы ў дачыненні да людзей, варта падтрымкі. Аднак якое менавіта месца ў гэтым пераліку аўтары адводзяць Трасцянцу? Нагадаем, што традыцыйна Трасцянецкі лагер смерці па колькасці знішчаных людзей стаяў на чацвёртым месцы пасля Аўшвіца, Майданака і Трэблінкі. У той жа час, паводле найноўшых звестак польскіх даследчыкаў, колькасць ахвяр у Майданаку складае каля 78 тысяч[32]. У гэтым выпадку аўтарам уступнага нарыса да зборніка дакументаў варта было прапанаваць спіс, які б не выклікаў у чытача лішніх пытанняў, а паказваў дакладнае месца Трасцянца ў агульным пераліку іншых лагераў смерці на карце Еўропы.

Не зусім удалай бачыцца фармулёўка: «„Окончательное решение” еврейского вопроса было изложено в „Ванзейском протоколе”, принятом руководителями нацистской Германии 20 января 1942 года. Программа предусматривала создание гетто для изоляции евреев и последующую их депортацию в лагеря уничтожения, устроенные подальше от Германии, чтобы не вызывать тревогу и недовольство своих граждан. Самым восточным в цепи лагерей уничтожения был Тростенец» (с. 7). Тут можна цалкам пагадзіцца толькі з апошнім тэзісам. Тады як рэшта патрабуе істотных удакладненняў. Па-першае, тэмай канферэнцыі, якая адбылася ў Берліне, на віле на вул. Гросэр Ванзэе, 56/58, было «агульнае вырашэнне яўрэйскага пытання ў Еўропе»[33]: удзельнікі сустрэчы з розных установаў, службаў і непасрэдныя адказныя імкнуліся скаардынаваць арганізацыйныя пытанні «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання» як

[32] *Deutsche Besetzung Polens 1939–1945* [online], https://de.wikipedia.org/wiki/Deutsche_Besetzung_Polens_1939%E2%80%931945 [доступ: 9.04.2018].

[33] P. Klein, *Die Wannsee-Konferenz* [in:] *Villenkolonien in Wannsee 1870–1945. Grossbügrerliche Lebenswelt und Ort der Wannsee-Konferenz,* Berlin 2000, s. 96.

доўгатэрміновай стратэгіі[34]. З вядомых дакументаў вынікае, што пачаткам «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання» на захопленай савецкай тэрыторыі, у тым ліку ў Беларусі, неабходна лічыць 31 ліпеня 1941 года, калі адпаведнае рашэнне было прынята шэфам нямецкай паліцыі бяспекі і СД обергрупенфюрэрам СС Р. Гейдрыхам. Таму праз паўгода, на сустрэчы 20 студзеня 1942 года, паведамлялася аб ходзе выканання гэтага рашэння і прынятых раней мер па масавым знішчэнні яўрэяў. Гэта відаць нават на прыкладзе шматлікіх беларускіх населеных пунктаў, дзе яшчэ ўлетку 1941 года пачалася і прайшла «першая хваля»[35] масавага знішчэння яўрэяў. Па-другое, на канферэнцыі ў Берліне не прымалася «праграма» па стварэнні гета з мэтай ізаляцыі яўрэяў і іх далейшай дэпартацыі. Аб рашэнні вызначыць Менск у якасці пункта дэпартацыі нямецкіх яўрэяў вядома з 10 кастрычніка 1941 года, калі ў час выступлення ў Празе Р. Гейдрых паведаміў аб планах адпраўкі 50 тысяч нямецкіх яўрэяў у Рыгу і Менск[36]. Па-трэцяе, у рамках раскрыцця храналогіі і геаграфіі дэпартацыі яўрэяў з краін Еўропы аўтары сцвярджаюць, што «да канца лістапада 1941 года, апрача транспарту з Гамбурга, у Менск прыбылі яшчэ шэсць цягнікоў з Дзюсельдорфа, Франкфурта-на-Майне, Берліна, Брно, Брэмена і Вены з агульнай колькасцю каля сямі тысяч чалавек» (с. 8). Заўважым, што апошні «спеццягнік»* з амаль 1000 венскіх яўрэяў прыбыў на станцыю Менск-Таварная не ў канцы лістапада, а 5 снежня 1941 года[37]. Апрача таго,

---

[34] P. Klein, *op. cit.,* s. 101.

[35] *Erste Tötungswelle* [у:] *Einsatz im „Reichskommissariat Ostland”. Dokumente zur Völkermord im Baltikum und Wiessrussland 1941–1944,* hrsg. von W. Benz, K. Kwiet, J. Matthäus, Berlin 1998, s. 71.

[36] Ch. Gerlach, *op. cit.*, s. 750.

* Тэрмін «спеццягнік» паходзіць ад назвы, якая фігуруе ў дакументах Чыгуначнай дырэкцыі Германіі – «спецыяльныя цягнікі для перасяленцаў, зборшчыкаў ураджаю і яўрэяў» (Sondezüge für Unsiedler, Erntehelfer und Juden).

[37] *Chronik der Erinnerung in Trostenez und Blagowschtschina* [in:] *Der Vernichtungsort Trostenez in der europäischen Erinnerung. Materialen zur Internationalen Konferenz vom 21.–24. März 2013 in Minsk,* Dortmund 2013, s. 9.

сярод сямі спеццягнікоў з названых вышэй гарадоў першы і перадапошні былі з Гамбурга. Пры гэтым 22 снежня 1941 года, на перадапошнім спеццягніку, разам з 500 гамбургскімі яўрэямі ў Менск былі дастаўлены 440 брэменскіх і 130 яўрэяў з нямецкага горада Штадэ. Адзначым, што ў пераліку асноўных транспартаў 1942 года (с. 8) аўтары не згадваюць аб чэрвеньскай дэпартацыі яўрэяў з Кёнігсберга і Берліна[38].

У канцы гістарычнай часткі нарыса аўтары прыходзяць да важнага вываду аб тым, што «работа Мінскай абласной камісіі садзейнічання НДК СССР у значнай ступені вызначыла разуменне Трасцянца ў савецкі час і працягвае з'яўляцца вызначальнай ў гады незалежнасці Беларусі» для рэканструкцыі драматычных падзей каля Малога Трасцянца ў 1942–1944 гадах (с. 14). Падзяляючы гэту думку, адзначым, што пастаноўка праблемы ў такім кантэксце існавала на працягу ўсяго пасляваеннага часу, таму заклала для беларускіх даследчыкаў не толькі трывалы падмурак, але і традыцыю не выходзіць за яе рамкі ў навуковым і грамадскім дыскурсе. Больш за тое, пастаўленая вышэй праблема лічбаў патрабуе ад цяперашніх даследчыкаў, каб яны, нягледзячы на панаванне традыцыйнага падыходу ў беларускай гістарыяграфіі, больш уважліва адносіліся да розных дакументальных крыніц, у тым ліку нямецкага паходжання. Аб гэтым размова пойдзе ніжэй.

Другая частка гістарычнага нарыса раскрывае пытанне аб захаванні памяці ў Беларусі аб загінуўшых у Вялікай Айчыннай вайне, у тым ліку ў Трасцянцы (с. 16–24). Першай установай, якая пачала збор дакументальных матэрыялаў і рэчавых доказаў аб лагеры смерці Трасцянец, быў БДМГВАВ. З моманту яго адкрыцця 22 кастрычніка 1944 года у пастаянных экспазіцыях былі прадстаўлены арыгінальныя прадметы з Трасцянца: будка вартаўніка, папераджальная шыльда, бервяно з вогнішча, на якім спальвалі забітых людзей, частка лагернай агароджы, асабістыя рэчы загінуўшых.

[38] N. Drober, *Ich heiße jetzt Nechama,* Berlin 2012, s. 8.

8 мая 1945 года ў афіцыйны дыскурс упершыню ўвайшоў тэрмін «лагер смерці Малы Трасцянец» (с. 16).

Аўтары гістарычнага нарыса адзначаюць, што пэўныя меры па ўшанаванні памяці ахвяр нацысцкага генацыду былі прыняты адразу ж пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У першых дакументах ішла размова аб неабходнасці захавання і догляду за могілкамі, галоўным чынам, загінуўшых воінаў Чырвонай Арміі і партызан. Як паведамлялася ў рэспубліканскім друку, 3 верасня 1944 года ў Малым Трасцянцы з удзелам больш як 10 тысяч жыхароў Мінска і суседніх вёсак «адбылося пахаванне астанкаў савецкіх грамадзян, па-зверску спаленых нямецкімі вылюдкамі» (с. 121). У снежні 1950 года былы лагер смерці Трасцянец быў уключаны ў спіс гістарычных помнікаў рэспубліканскага значэння. У канцы 1950-х гадоў выйшла пастанова ЦК КПБ (дак. № 207) з даручэннем Савету Міністраў БССР (СМ БССР) вырашыць пытанне аб арганізацыі ў в. Малы Трасцянец філіяла БДМГВАВ. Але праз тры гады гэта работа была спынена (с. 19). Адзначым, што ў пастановах ЦК КПБ (дак. № 207) і СМ БССР (дак. № 208) і загадзе міністра культуры БССР (дак. № 209), прынятых у канцы 1950-х гадоў, вядзецца размова аб адкрыцці філіяла БДМГВАВ у в. Малы Трасцянец, пры гэтым ні ў адным радку не згадваецца Вялікі Трасцянец. Як відаць з трох дакументаў, месцам увекавечвання памяці вызначана толькі в. Малы Трасцянец. У гэтым аспекце было б цікава азнаёміць чытача з рашэннем выканкама Мінскага раённага Савета дэпутатаў працоўных ад 12 жніўня 1959 года, не ўключанага ў зборнік дакументаў, які тут разглядаецца, паводле якога выканкам прыняў рашэнне «адвесці ўчастак зямлі пад будаўніцтва будынка філіяла Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з зямель саўгаса „Рассвет" у раёне в. Трасцянец плошчай 0,2 га ворыўнай зямлі»[39]. У канцы студзеня

[39] Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі (БДАНТД), ф. 3, воп. 1, спр. 1713, арк. 11 (рашэнне выканкама Мінскага раённага Савета

1960 года Дзяржкамітэтам па справах будаўніцтва і архітэктурны быў зацверджаны архітэктурны праект аб'екта № 249/59, распрацаваны «Белдзяржпраектам»[40]. Аўтары-укладальнікі зборніка пакідаюць чытача без адказу на галоўнае пытанне: чаму першы помнік у Трасцянцы быў адкрыты не ў адпаведнасці з вышэйзгаданымі рашэннямі, а ў зусім іншым месцы – каля в. Вялікі Трасцянец? Да таго ж, на помніку прыведзена недакладная колькасць ахвяр: замест 206500 – 201500. Як і чаму так адбылося? Тут патрэбна дадатковая праца гісторыкаў.

Дарэчы, аўтары ўводнай часткі ў зборніку дакументаў адзначаюць, што помнік у Вялікім Трасцянцы быў устаноўлены ў 1963 годзе на даволі значным аддаленні ад рэальных месц масавага знішчэння людзей. Пры гэтым звяртаецца ўвага чытача на тэкст згаданай вышэй мемарыяльнай дошкі з недакладнымі данымі. У 1965 годзе быў пастаўлены помнік на месцы былой калгаснай адрыны, у якой было знішчана 6,5 тысяч чалавек, у 1966 годзе – помнік ва ўрочышчы Шашкоўка на месцы спалення 50 тысяч чалавек у крэмацыйнай печы-яме (с. 18). На думку аўтараў, наступны этап у працэсе ўшанавання памяці ахвяр Трасцянца быў звязаны з узвядзеннем мемарыяльнага комплексу «Хатынь», важным элементам якога з'яўляецца Сцяна памяці з нішамі, адна з якіх ушаноўвае памяць ахвяр Трасцянца з указаннем лічбы загінуўшых – 206500 (с. 19).

Аўтары ўводзін адзначаюць, што ўвага гісторыкаў і грамадскасці да праблематыкі абудзілася ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гадоў, калі ўзніклі грамадскія аб'яднанні, якія пачалі разам з органамі дзяржаўнага кіравання рабіць захады па «стварэнні мемарыяльнага

---

дэпутатаў працоўных «Аб адводзе зямельных участкаў пад будаўніцтва будынкаў філіялаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны» ад 12 жніўня 1959 года). Аўтар выказвае падзяку за інфармацыю загадчыку аддзела інфармацыі і выкарыстання дакументаў БДАНТД кандыдату гістарычных навук С. В. Кулінку.

[40] *Ibidem*, арк. 5–10 (праектнае заданне філіяла Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў в. Малы Трасцянец, красавік 1959 года).

комплексу „Трасцянец”». У друку з’яўляліся шматлікія публікацыі[41]. Важнай вяхой у гэтай справе стаў 2002 год, калі дзякуючы ўдзелу Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ва ўрочышчы Благаўшчына на месцы знішчэння і пахавання 150 тысяч чалавек быў устаноўлены памятны знак у выглядзе каменя (с. 20). На наш погляд, наступным важным крокам, зробленым на дзяржаўным узроўні па захаванні памяці ахвяр Трасцянца, з’яўляецца рашэнне, якое было агучана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам 20 кастрычніка 2008 года, падчас цырымоніі ўшанавання ахвяр Менскага гета, з нагоды 65-й гадавіны яго знішчэння. Кіраўнік дзяржавы заявіў тады, што прынята «рашэнне аб стварэнні ў Трасцянцы велічнага мемарыяла Памяці»[42]. 8 чэрвеня 2014 года адбылася цырымонія, падчас якой А. Р. Лукашэнка заклаў капсулу на месцы будучага мемарыяльнага комплексу «Трасцянец». Першая чарга мемарыяла і яго асноўная кампазіцыя «Брама Памяці» была адкрыта з удзелам Кіраўніка дзяржавы 22 чэрвеня 2015 года.

Такім чынам, зыходзячы з факталагічнай насычанасці «Прадмовы» і навуковых ацэнак, выказаных аўтарамі ў дачыненні да гістарычных падзей на тэрыторыі «лагера смерці Трасцянец», на парадку дня стаіць надзвычай актуальная задача аб’ектыўнай рэканструкцыі таго, што тут адбывалася ў 1942–1944 гадах. Пры гэтым важна даць адказы на розныя пытанні, у тым ліку, што стала прычынай ператварэння Менска і яго ваколіц у раёне Малога Трасцянца ў адно з цэнтральных месц нацысцкага тэрору на ўсходзе Еўропы. Якое месца займае ў такім выпадку Трасцянец у сістэме нацысцкага генацыду мірнага насельніцтва, ваеннапалонных, удзельнікаў партызанскага руху і падпольнай барацьбы, а таксама

---

[41] *Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 18 мая 1994 г.*, «Трасцянец» 1994, № 1, ліпень, с. 1.

[42] *Выступление Президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко на мемориальном комплексе «Яма» в рамках мероприятий памяти Минского гетто. 20 октября 2008 г.* [online], http://netzulim.org/R/Events/65_MinskGetto/65_MinskGetto01.html [доступ: 10.08.2017].

беларускіх яўрэяў і яўрэяў з іншых еўрапейскіх краін? У чым жа заключалася гістарычная адметнасць гэтага месца масавага знішчэння ў рэгіянальным і еўрапейскім кантэксце?

Вызначаючы ступень навізны дакументаў, якія аўтары-укладальнікі апублікавалі, трэба адзначыць, што з 255 дакументаў і матэрыялаў упершыню апублікавана 143, або 56% ад іх агульнай колькасці. Пры гэтым у першай частцы зборніка агульная колькасць новых дакументаў складае 38,3%, а ў другой – 80,3%. Выходзіць, што толькі кожны чацвёрты дакумент датычыць праблемы памяці, тады як тры чвэрці ўсіх дакументаў і матэрыялаў прысвечаны гістарычным падзеям, якія дапамагаюць узнавіць шматлікія аспекты трагедыі міжнароднага маштабу ў раёне Малога Трасцянца.

Разглядаючы характар паходжання дакументаў першай часткі, відавочна, што на фоне разведзводкі (дак. № 28), стэнаграмы (дак. № 71), пісьма (дак. № 82), заяў (дак. № 51, 113), актаў судова-медыцынскага агляду (дак. № 48, 49, 65) цэлы масіў дакументаў складаюць пратаколы рознага паходжання, у тым ліку: допытаў сведак (дак. № 100, 137), апытання былых вязняў лагера Трасцянец (дак. № 39, 41, 69, 98, 113, 149, 150, 151, 170), допытаў жыхароў в. Малы Трасцянец (дак. № 55, 64, 152, 153, 154, 172, 173, 191), былых вязняў Менскага гета (дак. № 101, 102, 103), выратаваных ахвяр (дак. № 171, 174), а таксама былых нямецкіх ваеннаслужачых (дак. № 78, 79, 80, 112, 117, 118, 121, 122, 123, 124) і былых служачых мясцовых паліцэйскіх фарміраванняў (дак. № 112, 126, 127, 129, 138, 139, 140, 141, 143, 145, 146, 147, 148, 155, 156, 162, 163, 164, 165, 166, 167, 168, 169, 183, 184, 185, 196, 197, 188, 189, 190, 192). Абсалютная большасць дакументаў, прадстаўленых архіўнымі службамі КДБ РБ і Архівам дакументаў аўстрыйскага руху Супраціўлення ў Вене, выяўленых у фондах ДАРФ і ДАЛ, уведзены ўпершыню у абарот дзякуючы іх публікацыі ў зборніку. Фактычна ніколі раней не былі так шырока прадстаўлены ацэнкі непасрэдных выканаўцаў загадаў аб вынішчэнні савецкіх грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці, якія ўтрымліваліся ў Менскім гета, а таксама дэпартаваных

яўрэяў. Заўважым, што допыты былых нямецкіх ваеннаслужачых і служачых мясцовых паліцэйскіх фарміраванняў насілі тыповы характар і будаваліся на пытаннях і адказах. Увядзенне ў шырокі ўжытак кожнага са згаданых вышэй дакументаў патрабуе правядзення крытычнай навуковай верыфікацыі практычна кожнага гістарычнага факта, датычнага падзей у Менскім гета, у працоўным лагеры каля в. Малы Трасцянец і ва ўсіх месцах масавага знішчэння ў гэтым раёне.

Аналізуючы змест «Актаў судова-медыцынскіх аглядаў», праведзеных з 17 да 21 ліпеня 1944 года з мэтай выяўлення новых фактаў аб расстрэлах насельніцтва ў калгасным хляве каля в. Малы Трасцянец і ва ўрочышчах Благаўшчына і Шашкоўка, цікава параўнаць даныя аб колькасці ахвяр: «не менш за 3000 грамадзян» на месцы калгаснага хлява (с. 65), «не менш за 70 000 грамадзян», спаленых у яме-печы ва ўрочышчы Шашкоўка (с. 64), «не менш за 500 000 грамадзян», пахаваных ва ўрочышчы Благаўшчына (с. 94). Нельга абмінуць увагай і методыку падліку агульнай колькасці ахвяр, у аснове якой ляжаў раскоп толькі пяці ям, пасля чаго судова-медыцынская экспертыза рабіла заключэнне аб маштабах трагедыі ў 34 ямах-магілах ва ўрочышчы Благаўшчына.

Зварот да «Стэнаграмы пасяджэння Мінскай абласной камісіі НДК СССР», якое адбылося 12 жніўня 1944 года пад старшынствам В. І. Казлова і ў прысутнасці прадстаўніка НДК СССР акадэміка М. Н. Бурдэнкі, паказвае напружаны характар абмеркавання пытанняў, датычных месц пахаванняў і колькасці ахвяр на тэрыторыі Мінска і яго ваколіц, у тым ліку «на тэрыторыі былога лагера Трасцянец» (с. 106). Рабочае абмеркаванне паказала, што на той момант перад удзельнікамі камісіі паўстала задача «ўстанавіць больш правільную лічбу спаленых людзей у Трасцянцы» (с. 114). Менавіта такім падыходам кіраваўся начальнік аддзела Беларускай рэспубліканскай камісіі садзейнічання ў рабоце НДК СССР Р. Л. Логінаў пры вызначэнні канчатковай лічбы колькасці ахвяр у раёне в. Вялікі і Малы Трасцянец, адлюстраванай у цытаванай вышэй даведцы ад 25 жніўня 1944 года.

Адзначым, што аўтары-ўкладальнікі ўлічылі нашу заўвагу адносна арыгінала даведкі і прывялі яе цалкам[43]. Нагадаем асноўныя лічбы, прыведзеныя ў канцы жніўня 1944 года, якія дагэтуль з'яўляюцца прынцыпова важнай асновай для беларускай і замежнай гістарыяграфіі, аднак не сталі пакуль законам у навуковым і грамадскім дыскурсе. Пры гэтым звернем увагу на падыход, якім карыстаўся іх складальнік – следчы Р. Л. Логінаў. Не абмяркоўваючы дакументальных падстаў іх узнікнення, спецыяльна падкрэслім, што старшы лейтэнант Р. Л. Логінаў прывёў абсалютныя лічбы ахвяр у дачыненні да месц масавага вынішчэння ў Трасцянцы: у 34 ямах-магілах пахавана 150 000 чалавек; у калгасным хляве спалена 6500 чалавек; ва ўрочышчы Шашкоўка спалена 50 000 савецкіх грамадзян (с. 120). Заўважым, што ў выніку падліку атрымліваецца дакладная лічба ў 206500 чалавек, дзе адсутнічаюць удакладненні накшталт «прыблізна», «каля», «звыш» і г. д. Таму, нягледзячы на існаванне ў дакументах розных лічбаў, НДК СССР быў выпрацаваны адзіны падыход у дачыненні да колькасці ахвяр трагедыі каля в. Вялікі і Малы Трасцянец. Адзначым, што гэтыя лічбы застаюцца актуальнымі і сёння, таму імі трэба адказна карыстацца.

Сярод пратаколаў звернем увагу толькі на некаторыя. Гэта «Пратакол допыту былога вязня лагера Трасцянец М. М. Зарэцкай» ад 23 снежня 1954 года. На працягу нямецкай акупацыі яна жыла ў гета, з 1942 да кастрычніка 1943 года працавала ў аўтамайстэрні СД прыбіральшчыцай і дапамагала выдаваць рабочы інструмент. З кастрычніка 1943 года да 29 чэрвеня 1944 года знаходзілася ў лагеры Малы Трасцянец, дзе да моманту ўцёкаў працавала прачкай у пральні лагера (с. 154). Гэта «Пратаколы допытаў жыхаркі в. Малы Трасцянец А. М. Барысавай», якія былі складзены больш як праз 20 гадоў пасля трагічных падзей. Паводле двух пратаколаў, жыхарка в. Малы Трасцянец падчас акупацыі таксама працавала

[43] С. Новікаў, *Урочышча Благаўшчына…*, с. 23.

ў падсобнай гаспадарцы Менскага СД ў якасці рознарабочай на кухні. Знаёмства з матэрыялам допытаў дазваляе даволі дэталёва рэканструяваць асноўныя элементы функцыянавання лагера, вызначыць нацыянальны склад яго вязняў, месцы масавага знішчэння каля в. Малы Трасцянец (с. 286–290).

Сапраўдным адкрыццём у першай частцы зборніка можна назваць дакументы аб правядзенні следчых дзеянняў у адносінах да былога ваеннаслужачага латвійскай каманды СД А. І. Саўкіценса, які ў ходзе дазнання лакалізаваў на месцы не толькі асноўныя аб'екты падсобнай гаспадаркі менскага СД каля в. Малы Трасцянец, але і вызначыў дакладнае месцазнаходжанне раёнаў масавых расстрэлаў ва ўрочышчы Благаўшчына летам 1942 года. Асаблівую цікавасць у чытача выкліча дадатак да дакумента № 142, якім з'яўляецца схема размяшчэння асноўных аб'ектаў на тэрыторыі былой падсобнай гаспадаркі менскага СД – нямецкага маёнтка і месца масавага расстрэлу ва ўрочышчы Благаўшчына. На наш погляд, увядзенне гэтых дакументаў, асабліва схемы з нанесенымі аб'ектамі, дае магчымасць наблізіцца да больш дэталёвай рэканструкцыі месца трагедыі ў раёне Трасцянца (с. 230), а таксама параўнаць іх з іншымі вядомымі да гэтага часу матэрыяламі.

Не менш цікавым для чытача і важным для будучага даследчыка гэтай праблемы будуць «пратаколы былых ваеннаслужачых 5-й роты 13-га батальёна СД». Укладальнікі па нейкіх прычынах пакідаюць у назвах пратаколаў гістарычную недакладнасць, якая кідаецца на вочы но фоне таго, што пратаколы допытаў былых служачых літоўскіх або латышскіх паліцэйскіх батальёнаў (с. 176, 199, 264, 271, 277, 293 і інш.) утрымліваюць гэта важнае ўдакладненне (гл., напрыклад, дакумент «Из протокола допроса бывшего военнослужащего 3-го латышского батальона СД А. Я. Домбурса» (с. 176)), тады як практычна ні ў адной назве пратаколаў аўтары не пазначаюць нацыянальную прыналежнасць паліцэйскіх 5-й роты 13-га беларускага батальёна СД (гл., напрыклад, дакумент «Из про-

токола допроса бывшего военнослужащего 5-й роты 13-го батальона СД В. П. Денисова» (с. 302), а таксама дакументы на с. 306, 309, 313, 314, 316 і інш.). А між тым, практычна кожны пратакол допыту пачынаўся пытаннем аб нацыянальнай прыналежнасці паліцэйскіх гэтага батальёна (параўн. пытанне следчага: «Расскажите все вам известное об участии полицейских 5-й роты 13-го белорусского батальона СД в массовом уничтожении осенью 1943 года советских граждан еврейской национальности, содержащихся в Минском гетто» (с. 302)). З гэтых аднатыпных па змесце адказаў вынікала агульная карціна падрыхтоўкі і правядзення расстрэлаў вязняў Менскага гета восенню 1943 года з удзелам паліцэйскіх мясцовага паходжання на месцы масавага знішчэння ва ўрочышчы Благаўшчына (с. 310, 313, 316, 317 і інш.).

Асаблівую цікавасць выклікаюць пратаколы допытаў М. І. Валахановіча (с. 282) і Р. З. Бегуна (с. 290), якім удалося выратавацца ў час расстрэлаў у канцы чэрвеня 1944 года з былой калгаснай адрыны. Дэталі той трагічнай акцыі вядомы чытачу з артыкула К. Крапівы «Я быў у Трасцянцы» у газеце «Звязда» ад 6 верасня 1944 года. Аднак пратакол допыту, складзены праз 20 гадоў пасля падзей, даволі дакладна перадае іх сутнасць.

Такім чынам, кароткае знаёмства з новымі дакументамі і матэрыяламі, сабранымі ў першай частцы зборніка, пераконвае чытача ў асаблівай значнасці працы, якую правялі аўтары-ўкладальнікі па зборы і ўвядзенні ва ўжытак важных дакументальных фактаў. З'яўленне новых дакументаў дапамагае чытачу не толькі паглыбіць веды аб трагічных падзеях, але і патрабуе пошуку абгрунтаваных адказаў на пытанні, якія ўзнікаюць у працэсе чытання зборніка. Напрыклад, сярод архіўных матэрыялаў пакуль што не выяўлена большасць імянных спісаў ахвяр нацысцкага генацыду. Няма дакладных даных па многіх аспектах тых падзей.

Аналізуючы дакументы другой часткі, сабраныя аўтарамі-ўкладальнікамі пад назвай «Памяць», хочацца адразу адзначыць, што ўпершыню публікуюцца дакументы аб гісторыі ўшанавання памяці

абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны ў Беларусі ўвогуле і ў Трасцянцы ў прыватнасці. Прапанаваныя дакументы і матэрыялы не зусім адназначныя па змесце, маюць розныя крыніцы паходжання, але яны сведчаць пра той шлях, які прайшло беларускае грамадства з органамі ўлады на чале па шляху ўвекавечвання памяці воінаў Чырвонай Арміі і партызан[44], мірнага насельніцтва[45], а таксама адметных падзей[46] і ахвяр[47] Вялікай Айчыннай вайны. Як правільна адзначаюць аўтары ўводнага нарыса, працэс мемарыялізацыі месц трагічных падзей і ахвяр Трасцянца расцягнуўся на некалькі дзесяцігоддзяў і пакуль да канца не завершаны (с. 22).

Дзякуючы сабраным дакументальным крыніцам практычна ўпершыню можна раскрыць у гістарычным кантэксце, адпаведна выклікам часу і паводле прынятых дзяржаўных рашэнняў асноўныя этапы ўшанавання памяці ахвяр Трасцянца.

Агульнае знаёмства з новымі дакументамі пачнём з нешматлікіх па колькасці пратаколаў. Так, першы з іх сведчыць аб пасяджэнні ў студзені 2001 года аргкамітэта па стварэнні мемарыяльнага комплексу «Трасцянец» у ваколіцах урочышча Благаўшчына (дак.

[44] *Постановление Совета Народных Комиссаров БССР и ЦК КП(б)Б «О сохранении и уходе за местами захоронения воинов Красной Армии и партизан, погибших в Великую Отечественную войну и похороненных на территории Белорусской ССР» от 6 июля 1944 г.* [в:] *Увековечивание памяти защитников Отечества и жертв войны в Беларуси. 1941–2008 гг. Документы и материалы,* сост.: В. Адамушко [и др.], Минск 2008, с. 32–33.

[45] *Постановление Совета Министров БССР № 936 «О благоустройстве могил воинов Советской Армии, партизан и мирного населения, погибших в период Великой Отечественной войны на территории БССР» от 14 июня 1948 г.* [в:] *Увековечивание памяти…,* с. 57–59.

[46] *Постановление Совета Министров БССР № 248 «О благоустройстве мест захоронения воинов Советской Армии, партизан и мирного населения, погибших в 1941–1945 гг., и об увековечивании знаменательных мест и событий, связанных период Великой Отечественной войной на территории Белорусской ССР» от 8 апреля 1959 г.* [в:] *Увековечивание памяти…,* с. 116–117.

[47] *Постановление Совета Министров Республики Беларусь № 763 «Об увековечивании памяти защитников Отечества и жертв войн» от 21 декабря 1992 г.* [в:] *Увековечивание памяти…,* с. 191–192.

№ 219). У другім прыведзена стэнаграма нарады, якая адбылася 22 ліпеня 2009 года ў Мінскім гарвыканкаме, дзе разглядаліся пытанні стварэння мемарыяльнага комплексу «Трасцянец» (дак. № 240). Трэці фіксуе даручэнні старшыні Мінскага гарвыканкама, аддадзеныя ім 1 чэрвеня 2012 года на нарадзе па падрыхтоўцы да ўрачыстай цырымоніі закладкі «першага каменя» на месцы мемарыяльнага комплексу «Трасцянец», які праектаваўся, у сувязі з запланаваным візітам Прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль Ш. Перэса ў Рэспубліку Беларусь (дак. № 247).

Сярод дакументаў даволі важнай крыніцай з'яўляюцца пастановы розных органаў улады (дак. № 198, 200, 221, 232). Адзначым, што ў іх пераліку асобае месца займае пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (СМ РБ) № 654 «Аб стварэнні мемарыяльнага комплексу „Трасцянец" у г. Мінску» ад 22 мая 2002 года (с. 394–395). З яе вынікае, што стварэнне такога комплексу было агульнадзяржаўнай задачай (с. 399), у рамках якой ухвалялася Канцэпцыя стварэння мемарыяльнага комплексу «Трасцянец». Яна прыведзена ў зборніку ў якасці дадатку да дакумента № 221. Паводле Канцэпцыі, у мемарыяле прадугледжвалася стварэнне наступных кампазіцыйна-планіровачных вузлоў і элементаў: помнік-абеліск (існуе каля в. Вялікі Трасцянец); пункт прыёму вязняў (ДБУ-2); зона пражывання вязняў; крэматорый (урочышча Шашкоўка); месца масавых расстрэлаў і спальвання людзей (урочышча Благаўшчына); сцяна (пантэон) памяці загінуўшых (у выглядзе самастойнага аб'екта або ў складзе іншых аб'ектаў мемарыяла); «Дарога смерці»; плошча Супакаення і Прымірэння (з аб'ёмнымі сакральнымі збудаваннямі розных канфесій) (с. 399). На наш погляд, у гэтым пераліку адсутнічае яшчэ адзін гістарычны аб'ект, натуральныя контуры якога захаваліся да нашага часу і сведчаць пра тое, што ён быў створаны ў выніку работы вязняў працоўнага лагера каля в. Малы Трасцянец. Пабач з вёскай, з боку Магілёўскай шашы, знаходзіўся пясчаны кар'ер, у якім даводзілася працаваць не толькі вязням лагера, але і вязням

Менскага гета[48]. Якраз у гэтым кантэксце звернемся да дакумента, прыведзенага ў зборніку пад нумарам 225. Гэта «Зварот мэра г. Мінска М. Я. Паўлава да ўдзельнікаў міжнароднага конкурсу па стварэнні мемарыяльнага комплексу „Трасцянец"» (с. 405). Са звароту вынікала, што менавіта на месцы былога кар'ера прадугледжвалася стварэнне аднаго з «важных элементаў мемарыялу – парку „Даліна Памяці"» (с. 405), які відавочна выходзіў за рамкі Канцэпцыі[49]. Як вядома, вынікі конкурсу засталіся на паперы, хоць для яго правядзення з удзелам замежных спецыялістаў было прынята спецыяльнае рашэнне Мінгарвыканкама (дак. № 222). Вынікі конкурсу планавалася падвесці ў IV квартале 2003 года (с. 401). На наш погляд, уключэнне ў пералік гістарычных назваў мемарыяльнага комплексу рукатворнага кар'ера і вылучэнне яго ў якасці самастойнага аб'екта будзе служыць захаванню памяці аб маштабнай людской трагедыі.

Самую вялікую колькасць дакументаў у другой частцы зборніка складаюць пісьмы (дак. № 196, 202, 210, 220, 224, 226, 227, 228, 229, 233, 234, 236, 237, 244, 245, 246, 248, 249, 250, 251, 252, 253), якія раскрываць характар справаводства і паказваюць асноўныя этапы падрыхтоўкі і прыняцця важных рашэнняў дзяржаўнымі органамі, грамадскімі арганізацыямі і фізічнымі асобамі ў ходзе стварэння мемарыяльнага комплексу Трасцянец. Звернемся толькі да аднаго з іх – «Пісьма дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь К. В. Халопіка Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнку аб будаўніцтве мемарыяльнага комплексу „Трасцянец"» ад 23 лютага 2004 года. У ім дэпутат выказвае заклапочанасць у сувязі з тым, што пастанова СМ РБ ад 22 мая 2002 года № 654 «Аб стварэнні мемарыяльнага комплексу „Трасця-

[48] Р. Раппопорт, *Остаться собой* [в:] *Выжить – подвиг: воспоминания и документы о Минском гетто,* сост.: И. Герасимова, В. Селеменев, Минск 2008, с. 37.

[49] *Решение Минского горисполкома № 993 от 26 июня 2003 г. «О создании мемориального комплекса „Тростенец" в г. Минске»* [online], http://minsk.gov.by/en/normdoc/278 [доступ: 10.08.2017].

нец" у г. Мінску» знаходзіцца пад пагрозай зрыву, па прычыне чаго не ўдасца закласці мемарыял напярэдадні 60-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У гэтай сувязі дэпутат звяртаецца з «пераканаўчай просьбай разгледзець пытанне аб уключэнні будаўніцтва мемарыяльнага комплексу „Трасцянец" у пералік прыярытэтных прэзідэнцкіх праграм, якія знаходзяцца пад асабістым кантролем Кіраўніка дзяржавы» (с. 408–409).

У канцы другой часткі зборніка аўтары-ўкладальнікі прыводзяць са спасылкай на сайт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь два матэрыялы: «Інфармацыю аб удзеле Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі ў цырымоніі закладкі памятнай капсулы на месцы стварэння мемарыяльнага комплексу „Трасцянец" 8 чэрвеня 2014 года» (дак. № 254) і «Інфармацыю аб удзеле Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі ў мітынгу-рэквіеме „Брама памяці" 22 чэрвеня 2015 года» (дак. № 255). На наш погляд, у пералік афіцыйных дакументаў зборніка можна было б уключыць выступленне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у мемарыяльным комплексе «Яма», пра якое гаварылася вышэй. Асаблівая каштоўнасць гэтага выступлення заключаецца ў тым, што ў ім мемарыял у Трасцянцы характарызуецца ў якасці «агульнаеўрапейскага помніка»[50]. Гэта асабліва важна для разумення Трасцянца ў кантэксце агульнаеўрапейскай культуры памяці і вызначэння яго сапраўднай ролі ў міжнародным рэестры месц памяці аб ахвярах вайны. У немалой ступені пра гэта сведчыць і назва самога зборніка.

У заключнай частцы зборніка прапанаваны ілюстрацыі пад рубрыкай «Помнік у Трасцянцы – гэта сімвал асуджэння антычалавечай палітыкі нацызму ў адносінах да мірнага насельніцтва ўсёй Еўропы» (с. 448–469), 89 каментарыяў (с. 470–481), імянны (с. 482–492) і геаграфічны (с. 493–500) паказальнікі, а таксама пералік дакументаў (с. 501–515) і спіс скарачэнняў (с. 516–519). Кажучы пра пералік дакументаў, хацелася б адзначыць, што ў табліцы, у якой

---

[50] *Выступление Президента…*

укладальнікі сабралі паводле праблемна-храналагічнага прынцыпу ўсе дакументы і матэрыялы зборніка, было б пажаданым указанне ў апошнім слупку нумароў тых старонак, на якіх яны апублікаваны.

Такім чынам, выхад новага зборніка дакументаў і матэрыялаў пад агульнай назвай «Тростенец: трагедия народов Европы, память в Беларуси», падрыхтаванага аўтарытэтным аўтарскім калектывам і выкананага на тэму міжнароднага значэння, можна расцэньваць як знакавую падзею ў сучаснай гістарыяграфіі. Выяўлены ў розных архіўных фондах, сістэматызаваны і ўпершыню апублікаваны ўнікальны дакументальны матэрыял не толькі дазваляе раскрыць новыя старонкі трагічных падзей у раёне Трасцянца ў 1942–1944 гадах, але і ў вялікай ступені садзейнічае далейшаму вывучэнню гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, асабліва ў кантэксце паказу гэтага месца знішчэння людзей у ланцугу еўрапейскіх падзей перыяду Другой сусветнай вайны. Можна выказаць спадзяванне, што на аснове выкарыстання новай базы дакументальных крыніц і арыгінальных матэрыялаў даследчыкам не толькі з Беларусі, але і з іншых краін удасца ў бліжэйшы час правесці аб’ектыўнае вывучэнне гістарычных падзей у раёне в. Вялікі і Малы Трасцянец і знайсці адказы на малавывучаныя і дыскусійныя пытанні.

## Архіўныя крыніцы

Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі, ф. 3, воп. 1, спр. 1713, арк. 5–11.

## Літаратура

Benz W., *Nationalsozialistische Zwangslager. Ein Überblick* [in:] *Der Ort des Terrors. Geschichte der nationalsozialistischen Konzentrationslager. In 9 Bd.* Bd. I. Die Organisation des Terrors. 2. Auflage, München 2006.

*Chronik der Erinnerung in Trostenez und Blagowschtschina* [in:] *Der Vernichtungsort Trostenez in der europäischen Erinnerung. Materialen zur Internationalen Konferenz vom 21.–24. März 2013 in Minsk,* Dortmund 2013.

*Deutsche Besetzung Polens 1939–1945* [online], https://de.wikipedia.org/wiki/Deutsche_Besetzung_Polens_1939%E2%80%931945 [доступ: 9.04.2018].

Drober N., *Ich heiße jetzt Nechama,* Berlin 2012.

*Erste Tötungswelle* [у:] *Einsatz im „Reichskommissariat Ostland”. Dokumente zur Völkermord im Baltikum und Wiessrussland 1941–1944,* hrsg. von W. Benz, K. Kwiet, J. Matthäus, Berlin 1998.

Gerlach Ch., *Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944*, Hamburg 1999.

Jerzy Turonek, *Weißruthenien: Zweifrontenkrieg der Ideologien* [in:] *Anpassung – Kollaboration – Widerstand: kollektive Reaktionen auf die Okkupation,* hrsg.: W. Benz u. a., Berlin 1996, s. 191–198, рэц. С. Новікаў, «Беларускі гістарычны агляд» 1998, т. 5, сш. 2 (9), с. 577–580.

Klein P., *Die Wannsee-Konferenz* [in:] *Villenkolonien in Wannsee 1870–1945. Grossbügrerliche Lebenswelt und Ort der Wannsee-Konferenz,* Berlin 2000.

Kohl P., *„Ich wundere mich, dass ich noch lebe”: sowjetische Augenzeugen berichten,* Gütersloh 1990.

Mironowicz E., *Wojna wszystkich ze wszystkimi. Białoruś 1941–1944,* Kraków 2015.

Rentrop P., *Tatorte der „Endlösung“. Das Ghetto Minsk und die Vernichtungsstätte von Maly Trostinez,* Berlin 2011.

Ванькевич А., *Экскурсия в Тростенец,* Минск 1986.

*Выйшаў зборнік архіўных матэрыялаў, прысвечаных Трасянцу* [online], http://zviazda.by/be/news/20160620/1466441699-vyyshau-zbornik-arhiunyh-materyyalau-prysvechanyh-trascyancu [доступ: 10.08.2017].

*Выступление Президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко на мемориальном комплексе «Яма» в рамках мероприятий памяти Минского гетто. 20 октября 2008 г.* [online], http://netzulim.org/R/Events/65_MinskGetto/65_MinskGetto01.html [доступ: 10.08.2017].

*Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы,* сост.: В. Адамушко, Г. Кнатько, Н. Калесник, В. Селеменев, Н. Яцкевич, ред. Г. Кнатько, Минск 2003.

Новікаў С., *Урочышча Благаўшчына – месца масавага знішчэння людзей на тэрыторыі Беларусі,* «Беларускі гістарычны часопіс» 2013, № 10.

Падаляк Т., *Тэрыторыя смерці,* «Звязда» 2004, 2 сакавіка.

*Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 18 мая 1994 г.*, «Трасцянец» 1994, № 1, ліпень, с. 1.

*Преступления немецко-фашистских захватчиков в Белоруссии. 1941–1944 гг.*, Минск 1965.

Раманоўскі В., *Трасцянецкі лагер смерці* [у:] *Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941–1945. Энцыклапедыя*; рэдкал.: І. Шамякін (гал. рэд.) і інш., Мінск 1990.

Раппопорт Р., *Остаться собой* [в:] *Выжить – подвиг: воспоминания и документы о Минском гетто,* сост.: И. Герасимова, В. Селеменев, Минск 2008.

*Решение Минского горисполкома № 993 от 26 июня 2003 г. «О создании мемориального комплекса „Тростенец" в г. Минске»* [online], http://minsk.gov.by/en/normdoc/278 [доступ: 10.08.2017].

Романовский В., *Немецко-фашистская оккупационная политика и ее крах в Белоруссии (1941–1944 гг.). Диссертация на соискание ученой степени доктора исторических наук. 07.00.02,* Минск 1974.

*Тростенец,* сост.: С. Жумарь, Р. Черноглазова, Минск 2003.

*Тростенец: трагедия народов Европы, память Беларуси. Документы и материалы,* сост.: В. Адамушко [и др.]; редкол.: В. Андриевич (гл. ред.) [и др.], Минск 2016.

Туронак Ю., *Мадэрная гісторыя Беларусі,* Vilnius 2006.

*Увековечивание памяти защитников Отечества и жертв войны в Беларуси. 1941–2008 гг. Документы и материалы,* сост.: В. Адамушко [и др.], Минск 2008.